ЯНВАРЬ 2006

ИНФОРМИРУЙ ОКРУЖАЮЩИХ - ФОРМИРУЙ НАЦИЮ

# ИНФОРМАТОР

WWW.3DWAY.ORG



KAMUNIKAT.org

## В НОМЕРЕ:

«В своих карикатурах и мультфильмах я не оскорблял личного достоинства ни президента, ни политиков. Они — политические фигуры, и все касалось их политики, а не их личностей. Возбуждать уголовное дело за юмор и сатиру недостойно политиков, и это означает, что в стране что-то не в порядке, и не только с чувством юмора».

с. 2

Праз нашыя песьні мы намагаемся данесьці да моладзі, што беларусы – гэта не нацыя, а толькі адчэпак вялікай братэрскай Расеі, што стагоддзі эўрапейскай гісторыі больш ня маюць да нас ніякага дачыненьня.

с. 5



# НАШИ МУЛЬТЫ НЕ ЗАДУШИШЬ, НЕ УБЬЕШ!

**Автор белорусских политических флэш-мультфильмов Олег Минич уже несколько месяцев живет в столице Украины, находится в центре внимания масс-медиа и продолжает заниматься творчеством. О своих личных и творческих достижениях и планах он рассказал «БДГ».**

Минич покинул Родину осенью прошлого года. В августе республиканская прокуратура завела уголовное дело по ст.367 ч.2 (клевета на президента РБ) из-за мультфильмов, распространявшихся в Интернете как проект «Мультклуб». У Олега тогда конфисковали всю технику, а чуть позже забрали у аниматора и его жены паспорта. Безобидные сатирические мультфильмы могли принести автору до пяти лет заключения. Как только паспорта вернули, Минич принял решение уехать из страны: «Все было, как в дешевом детективе. Договорился со своими минскими знакомыми (Минич жил в Гродно. — С.Б.), чтобы они меня подбросили до Москвы, пришлось покрутиться по городу, чтобы убедиться, что за нами нет хвоста». В столице России Минич искал помощи в правозащитных организациях, но ощутимой поддержки так и не получил.

Пришлось ехать в Киев, в полную неизвестность. Там Минич познакомился с депутатом украинского парламента Григорием Омельченко, возглавляющим депутатскую группу по расследованию убийства журналиста Григория Гонгадзе, и Владимиром Казаневским, главой Союза украинских карикатуристов. С последним белорусский аниматор очень сдружился. Во время пресс-конференции, которая проходила как раз после принятия печально известных поправок к УК РБ, Олег рассказал украинцам: «Если я иностранным СМИ сейчас на пресс-конференции скажу, что в Беларуси очень плохо живется и все такое, то уже попал под статью и мне грозит до 2-х лет заключения. А у меня уже есть статья «Клевета в отношении президента». Вот и считайте — уже 7 лет в сумме!» Минич виноватым себя не считает: «В своих карикатурах и мультфильмах я не оскорблял личного достоинства ни президента, ни политиков. Они — политические фигуры, и все касалось их политики, а не их личностей. Возбуждать уголовное дело за юмор и сатиру недостойно политиков, и это означает, что в стране что-то не в порядке, и не только с чувством юмора». Как признается аниматор, страха он не ощущает, но вот осторожничать вынужден — несколько раз и в Киеве замечал слежку: «Как-то под своим окном увидел машину с дипломатическими номерами. Вышел из дома — машина медленно двинулась за мной. Я подошел и спросил: «Уж не за мной ли едем?» Люди, сидевшие там, были явно смущены, пробормотали нечто невразумительное насчет того, что их кто-то что-то попросил. И тут же уехали».




Белорусский аниматор участвовал в выставке «Коррупция и право», которую организовали украинские карикатуристы, выслал свои рисунки на ежегодную выставку карикатуристов Северной Америки. Несколько его работ были отмечены там призами. Продолжается работа и над флэш-анимацией: уже готовы несколько новых серий «Мультклуба». Они будут запущены в Интернет, как только аниматор почувствует себя в полной безопасности. «Мои планы таковы: оказаться в безопасном месте, подальше от белорусского КГБ. Более подробно сейчас, понятное дело, сказать не могу. Но я, хоть и оказался в очень тяжелом положении, все равно благодарен судьбе, потому что познакомился с массой интересных людей. Куда бы ни обращался в России и Украине — все слышали про мои мультфильмы!»

Кстати Мультфильмы Олега Минича доступны для скачивания в Интернете по адресам: www.mult.3dway.org , www.multclub.org , www.mult.batke.net.

***Сергей БУДКИН***
***Источник: БДГ***

# РАТАВАНЬНЕ НАЦЫІ ЦІ ЭМІГРАЦЫЯ



**Калі я была зусім маленькая, і жыла ў краіне пад назвай СССР, пра тое, што ёсьць эмігранты, дысыдэнты і таму падобныя людзі я ня ведала. Напэўна то была тамтэйшая дзяржаўная ідэалёгія – калі краіна зачыненая – тыя, хто з таго боку "ня з намі", але "супраць нас", таму іх проста як бы й няма. З іншага боку, бацькі, напэўна ведалі, але мне не распавядалі. Нават пра тое, што мой дзядуля спаліў хутар каб ня ехаць у Сібір, мне распавялі калі паварату, як тады здавалася, да таталіразму, больш быць не магло.**

Але цікава што маем зараз. А зараз мы думаем, што эміграцыя – гэта лёс слабых, справа нявартая і нізкая, а таму безпэрспэктыўная; здрада, урэшце. Ці гэта дасталося нам у спадчыну ад ідэалёгіі СССР, ці гэта ўжо новая дзяржаўная ідэалёгія (нашага) таталітарызму? Ці гэта сядзіць у нас ледзь не на генетычным узроўні, ці мы самі дазваляем (а часам прымушаем) сябе так думаць?

Эмацыйна я за тое, каб пакутваць у Беларусі, працаваць "на карысьць" беларускага народа і "супраць" сённешняга рэжыму. Вось толькі апошнім часам здаецца, што гэтая праца больш падобная на працу "насуперак" беларускаму насельніцтву і "на сьмех", а больш дакладна – "зьдзек" рэжыму. Таму мозг пачынае працаваць у трошкі іншым накірунку, то значыць разыходзіцца з эмоцыямі.

У сытуацыі падобнай на гэтую варта вылучыць мэты, а гэтаксама заняцца аналізам уласных магчымасьцяў. Мне заўсёды хацелася жыць у "шчаслівай, багатай і вольнай Беларусі". Менавіта гэта я загадвала ў 18 год, калі падалі зоркі з неба. І ў 18 год мне здавалася, што вось яшчэ пару годзікаў панапружваемся, папрацуем, вывучым дзяцей беларускай гісторыі, дадзім ім магчымасьць адчуваць беларускую культуру, думаць, адказваць за сябе і свой лёс – і ўсё будзе як марым. Сапраўды, што яшчэ трэба, каб працавалі механізмы грамадзянскай супольнасьці? Прайшло 8 год. Так, ёсьць 200 ужо не дзяцей, але маладых людзей, якія ведаюць гісторыю і паважаюць беларускую культуру, умеюць думаць і адказваць за сябе, ведаюць, што яны ня пустое месца і ад іх шмат што залежыць. Адна дзяўчына з гэтых двухсот запыталася мінулым летам ці, на маю думку, яны ад гэтага сталі шчасьлівей?.

Вяртаючыся да тэмы. Што сёньня (ня восем, ня пяць, ня тры, і нават не адзін год таму, але сёньня), можна зрабіць у Беларусі, каб стварыць сабе шчасьлівую, багатую і вольную краіну? Падпольна працаваць з дзецьмі якіх бацькі штодня просяць ня ўвязвацца ў палітыку (чытай у беларускую гісторыю, традыцыйную культуру, любы від грамадзкай дзейнасьці)? Падпольна выдаваць часопісы з інфармацыяй, якую прачытаюць максымальна слухачы Радыё Свабода? Спрачацца з малазнаёмымі людзьмі, даказваючы, што можна жыць лепей, калі яны штодня замбіруюцца (а значыць жадаюць замбірвацца) БТ пра сваё ўласнае шчасьце? Займацца маленькім бізнэсам, каб плаціць падаткі, якія ня дужа ніжэйшыя за даход (а далей, відавочна, будзе горш)? З усіх заняткаў у Беларусі адзіным пэрспэктыўным бачыцца мне нараджэньне дзяцей. Што яшчэ рабіць у краіне, дзе нікому (за выключэньнем маленькай часткі эліты) нічога не патрэбна, дзе апатыя стала проста нацыянальнай рысай – я ня ведаю. Як ня ведаю чаму мы мусім губляць жыцьцё на безсэнсоўнае выцягваньне насельніцтва з багны, калі яму там утульна?

Другое пытаньне – што можна зрабіць па-за Беларусьсю. Можна праз нейкі час пачаць свой маленькі бізнэс (на іх маленькі бізнэс трэба трошкі больш грошаў, чым на наш, таму папрацаваць папярэдне, альбо знайсьці інвестараў). А пасьля з маленькага бізнэсу зрабіць вялікі. І зарабіць шмат грошаў. Можна атрымаць вельмі добрую адукацыю і займацца Беларускімі праблемамі навукова. Паралельна завязваць карысныя сувязі ды прамаваць Беларусь разам з ейнымі каштоўнасьцямі й праблемамі, што не дасі нам застацца сам-насам з апошнімі. Можна стварыць беларускі асяродак і займацца грамадзянскай адукацыяй беларускай моладзі, рыхтаваць беларускую эліту на эміграцыі. І адчуваць сябе Чалавекам, бо ў роднай краіне адчуваньне ўласнага рабства зашкальвае (няўжо толькі за мяжой ад гэтага адчуваньня можна вызваліцца!). Карацей кажучы, ствараць інтэлектуальную і фінансавую эліту да часоў, калі яна спатрэбіцца ня толькі сабе самой, як зараз, але й беларускаму народу ў найшыршым сэньсе гэтага слова.

Як вядома, апатыя праходзіць. Раней ці пазьней. На маю думку існуючыя беларускія эліты сёньня ня ў стане выцягнуць з гэтага стану грамадства. Не таму, што эліты нейкія ня вартыя, а таму, што насельніцтва НЕ ЖАДАЕ. Сумна, але здаецца, што час на выцягваньне таго, што выцягнуць не магчыма, варта выкарыстаць для падрыхтоўкі да таго моманту, калі грамадства ўсё ж вырашыць, што яно хоча зьменаў. Так хоча, што згоднае нешта зрабіць для гэтага. Тады будуць патрэбныя грошы й сувязі, каб падтрымаць змены. Тады сапраўды будзе неабходная адукаваная эліта для кіраўніцтва дзяржаўнымі структурамі на розным узроўні, для адукацыі на сапраўды сусьветным узроўні, і для аграменнай колькасьці іншых справаў, каб зрабіць Беларусь сапраўды шчасьлівай, багатай і вольнай.

***Біруta Янкевіч***

# ДАРАГІЯ СЯБРЫ! СУПОЛЬНАСЬЦЬ "ТРЭЦІ ШЛЯХ" САРДЭЧНА ВІНШУЕ ВАС З НОВЫМ 2006 ГОДАМ!



**Прайшоўшы год прынес нам шмат выпрабаваньняў. Мы пачыналі як непалітычны маладзевы інтэлектуальны праект, падтрымліваючы сайт, арганізоўваючы сустрэчы і інтэрвію з знакавымі асобамі Беларусі. У жніўні нам давялося непасярэдна сутыкнуцца рэпрэсіўнай машынай беларускага рэжыму. Незадаволенасьць улады выклікала старонка сатырычных флэш-мультоў “Мультклюб”. У выніку незаконнай канфіскацыі тэхнікі, праца нашага сайту была паралізаваная на месяц. У кватэрах нашых актывістаў прайшліператрусы, некаторыя зь іх былі вымушаныя зьехаць за мяжу Беларусі.**

Тым ня меней, мы выстаялі і ўзмацніліся.

У верасьні мы цалкам аднавілі працу нашых сайтаў, зрабілі яе больш устойлівай да атакаў звонку і да масавай наведвальнасьці.

Створаныя новыя рубрыкі сайту – “Навіны” (найцікавейныя актуальныя навіны Беларусі), “Думкарэй” (бягучая падборка аналітычных матар’ялаў, зьявіцца ў он-лайн неўзабаве). Дададзеныя блёкі імпарту інфармацыі “Трэцяга Шляху” ў выглядзе RSS-стужкі і наладжаная трансьляцыя матар’ялаў з сайту ў Livejournal. Рэгулярна абнаўляецца разьдзел “Публікацыі” – намаганьнямі ўласных аўтараў і ў каапэрацыі з праектамі “Наше мнение”, “Студэнцкая Думка”, “Макасін”. Адноўленая праграма падтрымкі новых грамадзкіх інтэрнэт-праектаў байнэта. Новымі кнігамі папаўняецца бібліятэка на сайце “Трэцяга Шляху”, актывізаваўся форум. Ідзе праца над перакладам інтэрфэйсу асноўнага сайту на беларускую мову. Выходзіць і актыўна распаўсюджваецца ў Беларусі “Інфарматар”. Шырыцца колькасьць нашых чытачоў і актывістаў.

Мы дакладна ведаем, што надыходзячы год будзе не такім, як папярэднія. Шмат у чым падзеі гэтага году будуць вызначальнымі для будучыні Беларусі ў наступны пэрыяд часу. Нямала пераменаў прынясе гэты год.

**Няхай жа будуць гэта перамены да лепшага!**

Мы жадаем усім вам надзеі, жадаем вам веры ў свае сілы, веры ў лепшую будучыню Беларусі!

Мы жадаем вам заўжды ведаць, што нас большасьць, памятаць, што лёс Беларусі толькі ў нашых з вамі руках – і толькі ў нашых з вамі сілах зрабіць, каб чорны пэрыяд гісторыі нарэшце мінуў!

Мы жадаем вам моцы ў барацьбе за праўду. Зло абавязкова будзе пераможанае, мы зробім гэта!

**З новым годам! За нашу і вашу свабоду! За нашу і вашу перамогу!**

***Ваш, Трэці Шлях***

**ОПРОС Третьего Пути:**
**Почему Вы или известные Вам люди уехали из Беларуси:**




**(Все опросы Третьего Пути: http://3dway.org/poll)**

## ЧТО ТАКОЕ «ТРЕТИЙ ПУТЬ»?

**«Третий путь» — это способ участия в общественной и политической жизни нашей страны, а также открытая демократическая дискуссионная площадка, на которой обсуждаются темы, важные для сегодняшней и завтрашней Беларуси.**

# РАЗМОВА З ULTRAВОЖЫКАМ



**Маладыя зоркі пратэстнае сьцёб-музыкі UltraВожык. Шлях UltraВожык ад аматарскіх антылукашэнкаускіх запісау у інтэрнэце да месца у Тузіне гітоу. Пра творчасьць і лёсы радзімы у інтэрвію для Інфарматара.**

**1. Чаму - UltraВожык?**

Вожык – таму што робім вострую музыку. UltraВожык - таму што вельмі вострую.

**2. Калі Вы пачалі і з якой нагоды? Чаму выбралі такі фармат?**

Мы даўно робім музыку па-за складам UltraВожыка. У 2001 годзе, пасьля «элегантных» выбараў прэзыдэнта вырашылі, што надыйшоў час гэтак жа элегантна падзякаваць прэзыдэнту за яго шчырасьць ды павагу да свайго народу. Зрабілі «Лыжы» ды «Вусатага дэмакрата», зьмясьцілі ў Інтэрнэце разам зь песьнямі іншых прыхільнікаў аўтарытарызму. Народу спадабалася. Таму вырашылі і ў будучыні да гэтага праекту вяртацца.

**3. Вы адзін чалавек ці каманда?**

Мы – трыё.

**4. У Вашай творчасці, асабліва першых песьнях, адчуваецца моцны ўплыў «аратарскіх здольнасцей» нашага прэзыдэнта. Чым увогуле прывабны для Вас як стваральнікаў гэты вобраз?**

Усе вакальныя партыі выкананыя сьпевакамі UltraВожыка. Любыя падабенствы да іншых асобаў – выключна выпадковыя. З прэзыдэнтам мы ніколі не сустракаліся, ён нічым на нас не ўплываў, і мы ўвогуле ня ведаем, хто ён такі.

**5. Што Вас натхняе?**

Больш за ўсё нас натхняе наш духоўны лідар – сабачка Ібрагім. Але таксама вельмі натхняе БТ, Панарама… Часам людзі забываюцца, як добра яны жывуць, ды які нячэсны вакольны сьвет. Але БТ, ОНТ ды СБ нам аб гэтым упарта нагадваюць. Малайцы! І мы таксама будзем час ад часу нагадваць аб сапраўдным стане рэчаў.

**6. Як Вы ацэньваеце стан нашай моладзі сеньня? Што яе бянтэжыць, якія ў яе куміры, ці маюць сэнс для яе словы свабода, дэмакратыя, альбо ўжо не?**

Нашая моладзь, у сваёй большасьці, нічога не разумее! Юнакі думаюць, што толькі таму, што маюць па дзьве нагі, дзьве рукі ды галаву, яны – такія ж людзі як і ўсе іншыя народы Эўропы. Яны думаюць, што толькі таму, што іншыя эўрапейскія краіны абралі дэмакратычны лад жыцьця ды паважаюць так званыя правы чалавека, гэта трэба рабіць і нам. Праз нашыя песьні мы намагаемся данесьці да моладзі, што беларусы – гэта не нацыя, а толькі адчэпак вялікай братэрскай Расеі, што стагоддзі эўрапейскай гісторыі больш ня маюць да нас ніякага дачыненьня. Таму нам не патрэбныя аніякія атрыбуты дзяржаўнасьці, акрамя тых, што нагадваюць нам аб нашай належнасьці ды вялікай савецкай айчыне. І дэмакратыя нам не патрэбная, бо яна нясе толькі тэрарызм ды гомасэксуалізм. Гэтага моладзь, чамусьці, не разумее, а шукае куміраў сярод заходніх рок-зорак, у той час калі сапраўдным кумірам трэба лічыць усенародна і чэсна абранага… сабачку Ібрагіма.

**7. Дзе Вы знаходзіце сюжэты, тэмы сваіх песьняў?**

Паўсюль. Дастаткова вочы расплюшчыць.

**8. Якія у вас творчыя пляны?**

У складзе UltraВожыка плян ранейшы – час ад часу творчым чынам нагадваць нашым людзям аб тым, што з намі робіцца. Хутка вы зможаце пачуць нашую новую кампазыцыю, прызначаную да надыходзячых выбараў прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, несумненна самых чэсных у гісторыі краіны.

***Сайт и музыка UltraВожыка - http://www.luka.rocks.it/***

ОБРАЩЕНИЕ

# ДАВЛЕНИЕ НА УЧАСТНИКОВ ИНТЕРНЕТ-ПРОЕКТОВ УСИЛИВАЕТСЯ

Сообщество «Третий Путь» выражает озабоченность в связи с участившимися в последнее время случаями давления, оказываемого представителями спецслужб на участников независимых интернет-проектов.

Вот что сообщает пострадавший в этот раз студент Гомельского государственного университета им. Ф.Скорины (интернет-проект STUDGOMEL.COM):

“В районе Волотовы ко мне подошёл неизвестный мне человек, он не представился, и сказал: “Если хочешь дальше учиться - завязывай с этим”. Я считаю это типичным шантажом со стороны белорусских спецслужб. Режим не может запретить пока Интернет – последнее место, где ещё осталась свобода (пусть даже виртуальная), поэтому принимает любые попытки заткнуть людям рот. На сайте и дальше будут появляться статьи аналитического характера”.

Автор проекта Влад Михайлов также прокомментировал данный случай:

“Это не первый случай, когда на авторов, друзей и партнёров, сайта оказывается давление. Теперь же в ход идут самые грязные методы: шантаж, угрозы, провокации. Все, я надеюсь, прекрасно видят, в каком обществе мы живём. Наша заслуга в том, что мы можем сказать правду и донести её до людей, не имеющих возможности получать объективную информацию из государственных СМИ”.

Считаем, что подобные действия со стороны спецслужб направлены лишь на то, чтобы запугать участников независимых интернет-проектов. Такие действия со стороны спецслужб является юридически недопустимыми. Выражаем свой протест и солидарность с пострадавшими участниками интернет-проекта STUDGOMEL.COM.

Заметим, что до этого давлению подверглись представители нашего сообщества (дело Мультклуба), а также участники проекта «Лимон».

***Сообщество «Третий Путь»***

# НАШИ В АВСТРАЛИИ




**Многие белорусы наступление 2006-го года встретили на 9 часов раньше своих земляков. Это те наши соотечественники, которых судьба забросила в далёкую Австралию.**

Многие белорусы наступление 2006-го года встретили на 9 часов раньше своих земляков. Это те наши соотечественники, которых судьба забросила в далёкую Австралию.

Вдали от Родины отмечал Новый год и гомельчанин Сергей Одинец, который почти год назад вынужден был поселиться на зелёном континенте. В Беларуси он активно участвовал в политической жизни страны – возглавлял общественную организацию «Гарт», в 2001 году координировал молодежную мобилизационную кампанию по выборам президента по Гомельской области. После поражения демократических сил прошел несколько административных судов, был исключен из аспирантуры. Долгое время Сергей пытался найти работу в Гомеле – надо было содержать семью и годовалого сына. Будучи талантливым программистом, Одинец с трудом смог устроиться в компьютерную фирму. При этом он вынужден был скрывать место работы даже от близких друзей и родственников, чтобы не навредить работодателям.




Сергей Одинец и его семья не просили политического убежища, а выехали в Австралию по так называемым «независимым» визам. Эти визы могут получить только люди с высшим образованием, значительным опытом работы и со знанием английского языка. Говорит Сергей Одинец:

Амаль усе мае знаёмыя ў Сіднэі – гэта праграмісты ці іншыя IT-спэцыялісты, але ёсьць таксама архітэктары і інжынэры. Натуральна, гэтыя людзі даволі хутка знайшлі працу па спэцыяльнасьці. А вось шмат каму зь іхных супругаў даводзіцца перавучвацца і атрымліваць новую прафэсію, звычайна менш прэстыжную, чым атрыманую на радзіме. Напрыклад, мая жонка па адукацыі настаўнік, але тут скончыла курсы і будзе шукаць працу ў сфэры бізнэс адміністраваньня, па нашаму сакратарка.

До относительно недавнего времени эмиграция являлась закрытой страницей белорусской жизни, поскольку трактовалась однозначно как предательство. Сегодня, когда каждый третий белорус живет за пределами Беларуси, это явление уже на государственном уровне называют «утечкой мозгов». Причины эмиграции белорусской молодежи Сергей Одинец связывает прежде всего с политической ситуацией в стране.

Людзі едуць за лепшым жыцьцём і далей ад тых праблемаў, што не даюць жыць на бацькаўшчыне. Тут яны атрымліваюць значна лепшую якасьць жыцьця, магчымасьць набыць свой дом, добрую машыну, езьдзіць у адпачынкі па ўсім сьвеце. Па маіх назіраньнях, беларусаў у працэнтных суадносінах едзе болей чым расейцаў і украінцаў. Пэўна, гэта заслуга "прадуманай" палітыкі беларускага прэзыдэнта, які быццам бы стабільна "паляпшае" дабрабыт людзей і асабліва "клапоціца" пра моладзь.

Точного количества эмигрантов из Беларуси никто назвать не может, поскольку многие этнические белорусы по разным причинам не ощущают себя таковыми. Так, согласно официальной статистике, население Австралии составляет почти 20,5 млн. человек, при этом белорусами себя называют только около 500 человек. Про организованную белорусскую диаспору в Сиднее не слышал и Сергей Одинец, хоть прожил тут уже 11 месяцев. Он утверждает, что большинство мигрантов последней волны из Беларуси разговаривает на русском языке и соответственно принимает участие в русских сообществах, например, в русскоязычных воскресных школах для детей. Тем не менее, Сергей Одинец уверен, что изменение политического режима в Беларуси остановит массовое переселение за границу, а также приведет к росту национальнального самосознания в среде эмигрантов.

Думаю, што пасьля зьменаў да лепшага ў Беларусі хтосьці вернецца. Прынамсі, ведаю пра аднаго украінца, які вярнуўся пасьля памаранчовай рэвалюцыі.

***Виталий Алехнович***

http://www.dw-world.de/dw/article/0,2144,1842330,00.html

# 16 ЛЮТАГА - АКЦЫЯ "САЛІДАРНАСЬЦЬ БАЙНЭТА"

**Мы з вамі жывем у эўрапескай краіне, якая зьбілася з шляху дэмакратыі і прагрэсу. У ёй безь сьлядоў зьнікаюць людзі, якія наважыліся сказаць “не!” тыраніі.**

У ёй забіваюць журналістаў, якія не баяцца несьці людзям праўду пра таталітарны рэжым. Зь нядаўніх часоў паводле законаў ГЭТАЕ краіны можна трапіць у турму за крытыку існуючых тут парадкаў.

І ГЭТА краіна - НАША Беларусь!

У НАШАЙ краіне адымаюць магчымасьць выпісваць незалежную прэсу.

У НАШАЙ краіне няма тэлевізіі і радыё, якое агучвала б меркаваньні, адрозныя ад афіцыйнага.

Цяпер жа ўлада намагаецца ўсталяваць свой кантроль і над апошняй крыніцай аб’ектыўнае інфармацыі пра сытуацыю ў Беларусі - пагроза цэнзуры навісла над інтэрнэтам. Па некаторых зьвестках, беларускія спэцслужбы актыўна засвойвабць кітайскі досьвед блякаваньня “нежаданых” сайтаў у інтэрнэце. Набываецца праграмнае забесьпячэньне для перакрыцьця досягу да апазыцыйных уладзе web-сайтаў з кампутару на тэрыторыі Беларусі.

16-ы дзень кожнага месяцу - дзень нашае салідарнасьці. Салідарнасьці з сем’ямі зьніклых беларускіх апазыцыянэраў. Салідарнасьці з палітычнымі зьняволенымі, якія адплацілі свабодай за сваю сьмеласьць. Салідарнасьці памяці тых змагароў за свабоду, праўду пра загадкавыя абставіны сьмерці якіх мы даведаемся толькі калі наступяць іншыя часы. З кожным месяцам тысячы і тысячы людзей далучаюцца да акцыі салідарнасьці, запальваюы сьвечку на сваім акне.

16 лютага інтэрнэт-супольнасьць “Трэці Шлях” запаліць сьвечку салідарнасьці ў інтэрнэце. Як і ў рэальным сьвеце, аднаго нашага вакенца не дастаткова, і таму мы прапануем Вам далучыцца да акцыі “Салідарнасьць Байнэта”. На адну гадзіну з 19:30 да 20:30 менскага часу замяніце галоўную старонку свайго сайту на www.16.3dway.org, каб выказаць сваю салідарнасьць і паказаць тым, хто яшчэ сумняваецца, на што ператварыцца беларускі інтэрнэт, калі даць цэнзуры дабрацца да яго.

Яшчэ ня згасла наша надзея.
Яшчэ гарыць сьвечка ў нашым акне.
Мы будзем свабоднымі людзьмі ў свабоднай краіне.
Наша сіла - толькі ў салідарнасьці!

Калі Вы маеце тэхнічныя пытаньні альбо Вам патрабуецца тэхнічная дапамога - зьвярнецеся на e-mail тэхнічнае падтрымкі супольнасьці Трэцяга шляху: 3dway@3dway.org

Калі вы маеце іншыя пытаньні, зьвязаныя з акцыяй, зьвярнецеся на e-mail: papandos@gmail.com

***Сообщество «Третий Путь»***



# ДЕНЬ СОЛИДАРНОСТИ. ДЗЕНЬ САЛІДАРНАСЬЦІ?

Я никогда не был приверженцем существующей власти, много лжи и обмана слышал об оппозиции, много раз открывал ‘СовБелку’ и задавал себе вопрос: ‘В каком году я живу - в 1975 или в 1965 ?’ Но за последнее время понял одно: народ наш - вялое растение, не способное иметь НОРМАЛЬНУЮ оппозицию, НОРМАЛЬНУЮ власть, а главное, НОРМАЛЬНОЕ, во многом инстинктивное чувство выживания.

Я пишу на русском (что в последнее время мне не привычно), чтобы меня поняло больше людей не только в Беларуси, но и в других странах, чтобы каждый зажег свечу Свободы в своем окне, чтобы каждый дом (независимо от географического местоположения) осознал - он может бороться, не все решено за нас, а главное - МЫ МОЖЕМ!!!

В Польше в свое время в Дни Солидарности парализовывались электростанции, которые не смогли справиться с перепадами электронапряжения, сейчас наша оппозиция пытается создать нечто подобное. Лично я, как человек интересующийся политикой, очень поздно узнал о том, что означает эта надпись на стене - 16 внутри окружности. Так что же можно говорить о тех людях, которые не имеют доступа к Интернету, с недавнего времени к независимой прессе и радио Свобода. По статистике, об акциях белорусской оппозиции знает не больше 10%, поддерживает не более 3%... И те 3% не смогут доказать остальным 97, что они делают и для чего.

О чём думают люди, зажигая свечи Свободы? Неужели о Свободе? Ведь бойцы Красной Армии не думали о Сталине и Великой Социалистической Родине, идя в бой. Наверное, участники этих Дней Солидарности думают, как и солдаты Великой Отечественной, как и простые мещане и крестьяне на Грунвальде и под Оршей, о простых человеческих ценностях - любви, вере в Бога и будущем: Я не прошу вас зажигать эти свечи каждого 16-го числа, так же, как не просит батюшка верующих соблюдать пост. Главное, чтобы День Солидарности был в нашей душе, в нашем сердце. Просто помните - наша страна должна быть свободной, и дело не только в свечах на подоконниках, дело в Вере в Будущее, Вере в Победу: Эффективность Дня Солидарности покажет история. Безысходность нашей страны показывает настоящее. Я хочу, чтобы народ Беларуси понял, что будущее Беларуси в руках белорусов - нации, которая на 500 лет освободила Европу от немецкого солдата, нация, на языке которой разговаривали десятки народов от Балтии до Черноморья, нации, которая первой законодательно утвердила свою Независимость. И мы, несмотря на пропаганду, - ВЕЛИКАЯ НАЦИЯ!

За нами Сила, за нами Правда, за нами Победа!!!

***gerkules***

# ЗАСТАЦЦА ЦІ З'ЕХАЦЬ?

## ЧАМУ МОЛАДЗЬ НЕ ЖАДАЕ ЗАСТАВАЦЦА Ў "КВІТНЕЮЧАЙ" БЕЛАРУСІ?

Вядома, ня ўся моладзь, а толькі лепшыя яе прадстаўнікі. Тыя, хто не стаяць на месцы, жадаюць самарэалізавацца, імкнуцца да духоўнага й матэрыяльнага багацьця, прагнуць свабоды… У большасьці сваёй гэта маладыя людзі, якія ўжо сталі студэнтамі ці толькі зьбіраюцца імі стаць.

Яны, у адрозьненьні ад іншых, прагнуць ведаў і таму ведаюць, якое зараз у краіне становішча, і не жадаюць зь ім мірыцца. Студэнты бачаць, што перспектывы няма.

Сапраўды, што чакае выпускніка універа? Няблага, калі ты нарадзіўся й жыў да паступленьня ва універ у сталіцы. Тады цябе могуць разьмеркаваць куды-небудзь у Менску, дарэчы, не ў самае лепшае месца. Горш, калі ты прыехаў зь іншага горада з надзеяй скарыць сталіцу, таму што ў кіраўніцтва нашай краіны іншыя пляны. Якія? Я думаю, ўсе ведаюць – трэба ж падняць стратны калгас "Бальшавік", што ў забруджанай радыёнуклідамі Гомельскай вобласьці. І нічога, што скончыў ты, напрыклад, БДУІР па сьпецыяльнасьці праграмаваньне, таму што вымушаны будзеш "працаваць" пяць год на прадпрыемстве, дзе асноўнай задачай будзе зьмяненьне перагарэўшай лямпачкі…

Пападнімаўшы 5 год "звышпрыбытковае" прадпрыемства, згубіўшы кваліфікацыю, задумваешся: а што далей? А далей год 20 сумленнай працы, каб да пяцідзесяцігоддзя адсьвяткаваць уваходзіны ў аднапакаёвай кватэры.

Згадзіцеся, ня гэтага мы чакаем ад жыцьця. Вядома, не ўсім гэта відавочна, але я нікога й не зьбіраюся вінаваціць, таму што, каб гэта ўбачыць, трэба параўнаць нашу выспачку дэбільнасьці зь якой-небудзь буржуазнай краінай. Ведаючы гэта, кіраўніцтва Беларусі з кожным годам ставіць усё больш перашкодаў для выезда за мяжу (ці гэта экскурсія, ці адпачынак, ці летняя праца), ды й грошай на замежныя паездкі ў нашага беднага народа ня так і шмат.

Але, пабываўшы хаця б у Прыбалтыцы ці ў Польшчы, вяртаешся з такім уражаньнем, нібы пабываў на іншай плянэце. Пачынаеш задаваць сабе пытаньні:

Чаму мы не можам так жыць?

Чаму наша краіна ідзе не па шляху цывілізаванай Эўропы, а ўсё шукае свой, асобны?

Няўжо мы горшыя за іх?

Усе гэтыя "шкодныя" пытаньні й адказы на іх прыводзяць да таго, што задумваешся, а што, калі кінуць гэта ўсё, паступіць ва эўрапейскі ўнівер ці, скончыўшы ВНУ тут, з'ехаць да буржуяў і там атрымаць ПЭРСПЭКТЫВУ! Таму што жыць ты цяпер будзеш у краіне, дзе шануецца чалавек і яго меркаваньне, у краіне, дзе за працу людзі атрымліваюць чалавечыя заробкі, у краіне, дзе ты можаш набыць кватэру, машыну, прыгожае адзеньне, смачную ежу і самае галоўнае -у краіне, дзе ты можаш сябе самарэалізаваць!

Але з'ехаць з Радзімы ня так ужо й лёгка. Тут твае сябры, дарагія табе людзі, родная прырода. Тут людзі зь якімі можаш размаўльць на роднай мове (хоць іх не так многа, як хацелася б, але, усё ж такі, ёсьць), якія маюць аднолькавую з табой мэнтальнасьць. Ды трэба яшчэ дадаць, што ніхто за мяжой не чакае цябе зь распасьцёртымі абдымкамі, усё сваё жыцьцё ты будзеш там чалавекам другога гатунку.

Таму, я лічу, што самае правільнае рашэньне будзе застацца на Радзіме й змагацца за тую Беларусь, якую хочаш бачыць. За эўрапейскую, дэмакратычную, справядлівую…

Толькі разам мы пераможам!

***Siaroja***
***www.svaboda2006.org***




**Участвуйте в работе Третьего Пути!**
**/www.3dway.org/**

Уважаемые посетители нашего сайта,
Третий Путь делается такими же людьми как и вы. Мы развиваем и поддерживаем наш проект не только для общественного блага, но и для собственной самореализации. И это, поверьте, очень интересно и полезно!
Приглашаем Вас к нам присоединится. Пишите статьи и заметки, присылайте нам ссылки на заинтересовавшие вас события, информацию, сайты и проекты "Великой сети" и Байнета. Пополняйте нашу библиотеку новыми полезными книгами. Предлагайте свои идеи и помощь, критикуйте и вступайте в дискуссии на наших форумах.
Контактируйте с нами по эл. почте: judi@3dway.org и pavel@3dway.org

***С надеждой на вас!***
***Группа поддержки сайта Третьего Пути***

# АКЦИЯ СОЛИДАРНОСТИ В КИЕВЕ



Уже в третий раз по всей Украине проходит Акция Солидарности с теми, кто борется за свободу и права человека в Беларуси, с семьями пропавших без вести политиков и журналистов, с политическими заключенными Беларуси. С каждым разом к акции присоединяется все больше людей.

Больше полусотни киевлян участвовали в акции проходившей в Киеве вечером, 16 января. Так же в акции приняли участие представители различных белорусских и украинских организаций. В том числе и "Третьего пути".

Участники акции прошли по Хрещатику связанные друг с другом и зажгли свечи в знак солидарности с белорусским народом.

Представляем вашему вниманию фоторепортаж с акции.



## С ИСТОРИЕЙ НА "ВЫ"

# ВЛАДИМИР ОРЛОВ: С ИСТОРИЕЙ НА "ВЫ"

**В Беларуси все государственные службы ведут свою историю от Петра I. Даже на концерте этногруппы «Троіца» Иван Кирчук на чудесном белорусском языке сообщил, что до Петра белорусские солдаты служили всю жизнь, а тот ввел 25-летнюю рекрутчину. И запел о белорусском рекруте... Не кажется ли Вам, что пожарники, таможенники, военные, милиция, медики, лесники и прочие службы с удовольствием выводили бы историю своих коллег-предшественников из времен ВКЛ и Речи Посполитой, если бы имели эти данные под рукой?**

***Александр Винчевский***

Полностью разделяю Ваши, господин Винчевский, мысли и чувства. Многие наши сограждане, в том числе порой и очень достойные люди, почему-то не склонны утруждать себя знакомством хотя бы с каким-либо кратким изложением национальной истории. (В последнее десятилетие таких книг издано, слава Богу, немало; одна из них, к примеру, -- «Нарыс гісторыі Беларусі» Г.Сагановича). Угрожающе значительная часть населения независимой Беларуси – кто в силу столетней традиции, а кто и в результате, мягко говоря, недальновидного отношения к истории со стороны нынешних властей – продолжает пребывать в русскоцентричном поле, где прошлое нашей страны, исходя из давнишних имперских идеологем, трактуется всего лишь как часть истории России. А ведь вопрос о том, может ли человек, не знающий собственной истории, считаться образованным, еще в незапамятные времена отнесен к риторическим.

К белорусским рекрутам Петр I никакого отношения действительно не имеет, так как в то время наши предки жили в собственном государстве – федерации Великого княжества Литовского и Польского королевства, вошедшей в историю как Речь Посполитая. Армия ВКЛ формировалась совершенно на иных принципах, нежели царская. Рекрутские наборы, поставлявшие из белорусских губерний «пушечное мясо» для захватнических царских походов, стали одним из «благодеяний», которые обрушились на нас после захвата Беларуси Российской империей. (Царская, а вслед за ней и советская историография неизменно именовали инкорпорацию «воссоединением»). Рекрутчина на бывших землях ВКЛ была введена в правление Екатерины II, причем до 1793 г. рекруты служили всю жизнь, затем эту «почетную обязанность» ограничили «всего» четвертью века, а последующее сокращение до 20 лет произошло только в 1834 г.

Едва ли не каждая из традиционных государственных служб и структур и впрямь могла вести свою летопись и устанавливать профессиональный праздник, исходя из собственного, а не соседского прошлого. Почему бы Днем защитников Отечества вместо 23 февраля (даты очень сомнительной даже по мнению многих российских историков и совершенно не «нашей») не сделать 15 июля, когда в 1410 г. белорусские полки внесли огромный вклад в разгром армии Тевтонского ордена под Грюнвальдом, после чего пять веков нога вооруженного немца не ступала на нашу землю? Или, скажем, новомодные юбилеи нынешних областей. Логичнее было бы вычислять круглые даты от образования соответствующих воеводств ВКЛ, а не царских губерний, в которых проводилась, по сути, колониальная политика. Минская губерния, к примеру, была образована в 1793 г., а Минское воеводство – в 1565-м. Почувствуйте разницу!

# ВСЁ НАПОМИНАЕТ МНЕ О БЕЛАРУСИ

Почти два года, как я живу в США. Новые друзья, люди, впечатления, новая жизнь!

Несмотря на то, что это новая страница в моей жизни, я снова и снова перелистываю предыдущие. Все время сравниваю, прохожу через все ступени Разницы старой и новой жизни. Иными словами, учусь жить по-американски.

Как только переехала сюда, пыталась найти белорусскую диаспору, но все пока безрезультатно. Тут русскоязычное население на вес золота, а что говорить о белорусах... Однажды, в Нью- Йорке, я познакомилась с девушкой, она сказала - О, Беларусь, а я знаю! Я много путешествовала по Европе! - Вот это было приятным сюрпризом! И, конечно, не забуду чувство гордости за Беларусь, которое я почувствовала, когда увидела работы и книгу Марка Шагала в Музее современного искусства в Сан-Франциско! Да, все-таки мы не маленькая страна, а полная талантов огромная Беларусь! И все равно, если тут знакомишься с кем-нибудь из американцев - будь готов, что придется обязательно объяснять, где находится Беларусь и что такое Минск. И, кстати, на этот случай у меня всегда при себе карта и несколько фотографий Минска.

Давно известно, что интернет - это огромный носитель информации, только так я могу связываться с семьёй, друзьями и быть в курсе новостей. Я решила читать новости на белорусских сайтах. Кстати, на мои многочисленные письма по белорусским сайтам ответили только с 3 пути.

Потом появилась идея написать статью в местную газету о Беларуси. Я надеюсь, что так люди будут знать больше о Беларуси, надеюсь, получу письма и отзывы читателей о моей статье.

***Алеся Флоро, Калифорния***

## 3D NET НАВИГАТОР

**ПИЩА ДЛЯ УМА:**

**Третий путь (www.3dway.org)** – информационно-политический сайт, дискуссионная площадка Байнета. Независимое молодежное интернет-сообщество.

**Наше Мнение (www.nmnby.org)** — независимый политологический интернет-проект, уже более полутора лет задающий уровень академической дискуссии в Байнете. Замечательный творческий коллектив, ведущие интеллектуалы страны, широкий выбор тем для обсуждения — все это делает Наше Мнение местом, которое обязательно стоит посетить.

**Сайт Интернет-движения (www.worvik.com)** — рожденное в форумах ТУТ, Движение по прежнему живет и развивается

**РАЗВЛЕЧЕНИЯ:**

**Мультклуб (www.multclub.org)** — Юмористический портал студии политической анимации "Мультклуб". Мультики про Лукашенко и не только.

**Белорусская жаба (www.belzhaba.com)** — Самая полная коллекция юмористических коллажей на политические темы Беларуси. Регулярно пополняется.

**ПОАКТИВНИЧАТЬ:**

**Молодежная кампания «Крона:** Я хочу перемен!» (hoch-u.peremen.org) – это объединение нового поколения гражданских активистов. Мы обеспечиваем их ресурсами и профессиональной информационной и организационной поддержкой с целью обеспечения контроля за действиями властей в год выборов и информирования своих сверстников, родителей, соседей о ситуации в стране, обеспечения активности молодежи на выборах.

**Проект «Лимон» (www.limony.org)** — Лимон - сладко не будет! Юмористический молодежный проект "любителей" Батьки.

**Маладзёвая ініцыятыва «ВОКА» (moladz.org)** — Беларускі незалежны рух накіраваны на выхаванне моладзі на грунце беларускай нацыянальнай ідэі, і данясенне яе да шырокіх колаў грамадства.

**СВОБОДНАЯ ПРЕССА:**

**Белорусский партизан (www.belaruspartisan.org)** — этот сайт личная инициатива группы журналистов, белорусов, живущих в Минске и уехавших в другие страны. Мы не политики, не революционеры и не партийные пропагандисты. Мы просто стараемся создать пространство для свободного и честного обмена информацией.

**БДГ (www.bdg.by)** — известная белорусская общественно-политическая газета. Одна из наиболее нелюбимых нынешней белорусской властью.

**БелГазета (www.belgazeta.by)** — популярный общественно-политический еженедельник.

**Немецкая Волна (белорусская служба) (www.dw-world.de/dw/0,2142,9500,00.html)** — Сайт белорусской редакции радиостанции Немецкая Волна. Передачи о событиях в Беларуси и вокруг нее.

**Радио Свобода (www.svaboda.org)** — лучший белорусскоязычный новостной ресурс для Беларуси.

**Белорусские новости (www.naviny.by)** — популярная белорусская интернет-газета агентства БелаПАН

**Хартия-97 (www.charter97.org)** — ежедневные новости из Беларуси на сайте пресс-центра гражданской инициативы "Хартия-97"

**ИноСМИ (www.inosmi.ru)** — специализируется на трансляции наиболее ярких и примечательных материалов зарубежных СМИ на русский язык. Ежедневно прорабатывается более 300 зарубежных изданий и транслируются в переводе наиболее репрезентативные публикации.


# ИНФОРМАТОР - печатное издание сообщества «Третий Путь» www.3dway.org.

**Информатор отражает совокупность мнений своих авторов. Каждый из авторов несет персональную ответственность за достоверность и морально-этический аспект представленной в его материале информации.**

**Тираж:** 299 экземпляров.
**Доступен** в электронном виде по адресу gazeta.3dway.org
**Распространяется** бесплатно на правах рекламного материала.
**Подлежит** свободному копированию и распечатке.
**Контактная информация редакции:** pavel@3dway.org